странных дел КНР. 03.12.2013. – Режим доступа: < http: / / www. fmprc. gov. cn /mfa_ chn / zyxw_ 602251 /t1105278. Shtml >. – Дата доступа: 20.11.2021 (на кит. яз.).

11. *Ван, И.* Таньсо чжунго тэсэ даго вайцзяо чжи лу = Изучение пути дипломатии великих держав с китайскими особенностями [Электронный ресурс] / И. Ван // Народное обсуждение. 2013. – Режим доступа: <https://wenku.baidu.com/view/b66d036c6e175f0e7cd184254b35eefdc9d3150c.html>. – Дата доступа: 10.11.2021 (на кит. яз.).

12. *Ян, Цзечи.* Куаюэ тайпинян дэ хэцзо янцзечи тань сицзиньпин чжуси юй аобама цзунтун ань на бо гэ zхуанюань хуэйу чэнго = Сотрудничество через Тихий океан - Ян Цзечи рассказывает об итогах встречи президента Си Цзиньпина и президента Обамы в Annenberg Estate [Электронный ресурс] / Ян Цзечи // Агентство Синьхуа. 10.06.2013. – Режим доступа: < http://www.xinhuanet.com/world/2013-06/09/c_116102752.htm>. – Дата доступа: 16.11.2021 (на кит. яз.).

**(Дата подачи: 24.01.2022 г.)**

*З. В. Чэчулін*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*Z. Chechulin*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 930.25**

# ІНВЕНТАР КРАКАЎСКАГА КАРОННАГА АРХІВА 1551 Г. ЯК КРЫНІЦА ПА РЭКАНСТРУКЦЫІ АРХІВА ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ (1367–1392 ГГ.)

# INVENTORY OF CRACOW CROWN ARCHIVE 1551 AS THE SOURCE OF RECONSTRUCTION THE ARCHIVE OF GRAND DUKES OF LITHUANIA (1367–1392)

*Артыкул тычыцца праблемы інфармацыйнага патэнцыялу інвентара Кракаўскага Кароннага архіва як крыніцы па рэканструкцыі архіва вялікіх князёў літоўскіх (1367–1392 гг.). Аўтарам ідэнтыфікавана 11 дакументаў, паходзячых з архіва вялікіх князёў літоўскіх, якія трапілі ў выглядзе двух дакументальных комплексаў у Кракаўскі Каронны архіў у 1386 і 1395 гг. і апісаны ў інвентары ў якасці рэгестаў. Акрамя таго, падаюцца актуальныя на дадзены момант архіўныя шыфры ідэнтыфікаваных паводле інвентара дакументаў.*

*Ключавыя словы: інвентар; Кракаўскі Каронны архіў; архіў вялікіх князёў літоўскіх; дакументальны склад.*

*The article deals with the problem of information potential of the inventory of the Cracow Crown Archive as a source for the reconstruction of the archive of the Grand Dukes of Lithuania (1367–1392). The author identified 11 documents come from the archive of grand dukes of the Lithuania, which got place in Cracow Crown Archive two times: in 1386 and in 1395. Also it*

*described in the inventory as regestas. In addition, the current archival codes of the documents identified by the inventory are provided.*

*Keywords: inventory: Cracow Crown Archive; archive of the grand dukes of the lithuania; documentary content.*

Вывучэнне архіва вялікіх князёў літоўскіх кан. XIV ст. ускладняецца адсутнасцю поўных і сістэматызаваных вопісаў архіва. Гэта тлумачыцца незахаваннем і адсутнасцю шэрагу гістарычных крыніц, іх нешматлікасцю, улічваючы, што за XIV–XV стст. мы не ведаем ніводнага архіўнага вопісу каралеўскіх і велікакняжацкіх архіваў Польшчы і ВКЛ. У гістарыяграфіі амаль адсутнічаюць паўнавартасныя працы, якія б асвятлялі дакументальны склад архіва як сістэматызаванага і ўпарадкаванага збору.

Як і многія манархі сярэдневечых дзяржаў, вялікія князі літоўскія пасля атрымання княжацкага тытула пачалі сістэматычна назапашваць дакументы. Вядома, што вялікакняжацкія архівы былі створаны ўжо ў часы Міндоўга і Гедыміна [1, с. 129–130; 2, s. 1–2; 3, s. XVII–XXIII]. Але гісторыкі мала надавалі ўвагі такому сацыякультурнаму феномену, як велікакняжацкі архіў. Для большасці навукоўцаў адзінка архіўнага захавання велікакняжацкага архіва трансфармаравалася ў постаць толькі выключна гістарычнай крыніцы. Такі падыход не спрыяе разуменню архіва як сістэматызаванага збору дакументаў, звязанага з архіваўтваральнікам. Цяжкасці ў вывучэнні архіва вялікіх князёў літоўскіх дадае спецыфічная сістэма кіравання дзяржавай у другой палове XIV ст.

Тэксты дакументаў, якія былі адзінкамі архіўнага захавання архіва вялікіх князёў літоўскіх за перыяд сяр. XIII – сяр. XIV ст., вядомыя з прычыны таго, што ў канцылярыях Рымскай курыі і Тэўтонскага Ордэна ўжо ў другой чвэрці XIII ст. вялося сістэматызаванае стварэнне копій выходнай дакументацыі. Многія з дакументаў былі скапіяваны цалкам, некаторыя з іх дайшлі да нашых часоў у выглядзе трансумптаў і рэгестаў у зборніках археаграфічных публікацый.

Дакументальныя страты архіва вялікіх князёў літоўскіх могуць сведчыць аб тым, што палітычныя і сацыяльныя катаклізмы дэструктыўна ўплывалі на захоўванне архіўнага комплексу да 1386 г. Разам з тым варта разумець, якую ролю велікакняжацкі архіў адыгрываў у тагачасным грамадстве ВКЛ. Прасторна-часавы кантыніум тых часоў быў у велізарнай ступені прасякнуты рытуаламі і сымбалізмам. Архіў выступаў не толькі выключна ў якасці сістэматызаванага збору дакументаў, а яшчэ як легітымны інструмент улады, у пэўнай ступені рэпрэзентуючы «прысутнасць» гэтай улады.

Мэтай дадзенага артыкулу з’яўляецца раскрыццё інфармацыйнага патэнцыялу інвентара Кракаўскага Кароннага архіва (далей – ККА) 1551 г. і яго выкарыстанне дзеля рэканструкцыі першапачатковага дакументальнага складу архіва вялікіх князёў літоўскіх у 1367–1392 гг. (табліца).

*Табліца*

**Спіс дакументаў велікакняжацкага архіва 1367–1392 гг., трапіўшых у Кракаўскі Каронны архіў (ККА) (выбарка з аддзелу «Litvania» інвентара ККА 1551 г.)**

| № | Дата | Загаловак | Сучаснае месцазнаходжанне |
|---|---|---|---|
| 1 | 7 лістапада 1367 г. | Акт мірнай дамовы лівонскага ландмайстра Вільгельма фон Фрымерсхайма з в. к. л. Альгердам аб буфернай зоне паміж Лівоніяй і ВКЛ | AGAD Zbiór pergaminów № 4526 |
| 2 | 6 ліпеня 1382 г. | Перамірны ліст вялікага маршала ТО Куна фон Гатштайна з в. к. л. Ягайлай | BCzart. Perg. 185 |
| 3 | 23 мая 1385 г. | Гарантыйны ліст аб перамір'і з боку Конрада Цольнера фон Ротэнштайна да в. к. л. Ягайлы | AGAD, Zbiór pergaminów № 4433 |
| 4 | 23 мая 1385 г. | Гарантыйны ліст аб перамір'і з боку Конрада фон Валенрода да в. к. л. Ягайлы | AGAD, Zbiór pergaminów № 4484 |
| 5 | 28 красавіка 1387 г. | Прывілей польскага караля, найвышэйшага князя літоўскага Уладзіслава II Ягайлы свайму брату в. к. л. Скіргайле | БАН РФ. 4.6.44 |
| 6 | 9 ліпеня 1387 г. | Акт мірнай дамовы паміж Лівонскім Ландмайстарам Робінам фон Эльцам і в. к. л. Скіргайлам | AGAD, Zbiór pergaminów № 4485 |
| 7 | 1 кастрычніка 1388 г. | Дагавор паміж кіраўніцтвам ТО і в. к. л. Скіргайлай аб вяртанні палонных рыцараў Тэўтонскага Ордэна | AGAD, Zbiór pergaminów, № 24 |

*Заканчэнне табліцы*

| № | Дата | Загаловак | Сучаснае месцазнаходжанне |
|---|---|---|---|
| 8 | 29 мая 1389 г. | Перамірны акт Вітаўта да в. к. л. Скіргайлы | AGAD, Zbiór pergaminów № 4443 |
| 9 | 5 студзеня 1390 г. | Акт мірнай дамовы паміж комтурам Дзюнабурга Берндтам Хефельманам і в. к. л. Скіргайлам | BCzart. Perg. 222 |
| 10 | 1391 г. | Прывілей Уладзіслава II Ягайлы свайму брату в. к. л. Скіргайле на Вільню, Віцебск, Мерач і Гародню | Невядомы. Арыгінала не было ўжо ў XIX ст. |
| 11 | 6 снежня 1392 г. | Перамірны акт паміж Вітаўтам і Скіргайлам | BCzart. Perg. 236 |

Храналагічныя межы даследавання абраны на падставе таго, што рэгест дакумента, звязанага з велікакняжацкім архівам Альгерда Гедымінавіча (1367 г.) з'яўляецца самай ранейшай згадкай дакумента з велікакняжацкага архіва, трапіўшага ў ККА. Рэканструкцыя архіва вялікіх князёў літоўскіх 1367–1392 гг. з'яўляецца актуальнай навуковай задачай, таму крыніцазнаўчы аналіз аднаго з аддзелаў інвентара закладзе базіс для далейшых навуковых штудыяў.

Інвентарызацыя архіваў – адзін з важных элементаў сістэматызацыі назапашаных дакументаў. Спробы інвентарызацыі кракаўскага каралеўскага архіва ўсходзяць яшчэ да часоў Я. Ласкага (1505 г.), але першы інвентар архіва быў  складзены толькі ў 1551 г. Марцінам Кромерам (1512–1589). М. Кромер – вядомы царкоўны і палітычны дзеяч эпохі Жыгімонта I Старога і Жыгімонта II Аўгуста. У 1544 г. атрымаў пасаду каралеўскага сакратара [4, s. 256].

Складзены ім інвентар структурна складаецца з некалькі аддзелаў, схема сістэматызацыі – геаграфічна-храналагічная. Нас будзе цікавіць адзел інвентара пад назвай «Litvania». Дадзеная частка інвентара, як і астатнія тэматычныя раздзелы, складзена таксама па храналагічнаму прынцыпу. Пад кожным годам ідуць рэгесты дакументаў, для пазначэння асобнай адзінкі захавання рэгест пісаўся з новага радка пад адпаведным годам. Пад рэгестам у навуковай літаратуры па спецыяльнай тэрміналогіі разумеюць кароткі пераказ дакумента. У пэўнай ступені рэгест можна атаясамляць з такім элементам апісання, як загаловак дакумента [5, с. 455–457].

Частка архіва, прысвечаная дыпламатычным зносінам манархаў ВКЛ з Тэўтонскім ордэнам (далей – ТО) і яго Лівонскім ландмайстарствам, прадстаўлена шэрагам дакументаў. Найбольш даўні дакумент, які па сваёй правеніенцыі з'яўляецца актам, створаным у канцылярыі Лівонскага магістра, і трапіўшы ў велікакняжацкі архіў Альгерда Гедымінавіча, датаваны ў вопісе 1367 г. Супаставіўшы рэгест у інвентары М. Кромера і запіс на адваротным баку дакумента па лічбавай фатакопіі арыгінала, можна заўважыць амаль абсалютную ідэнтычнасць інвентарных памет [6].

Такім чынам, дакумент, апісаны ў М. Кромера, варта ідэнтыфікаваць як дагавор Вільгельма фон Фрымерсхайма з Альгердам і Кейстутам аб стварэнні буфернай зоны паміж Лівоніяй і ВКЛ ад 7 лістапада 1367 г. [5, с. 455; 7, с. 28–30]. Акрамя таго, С. У. Палехаў расчытаў і датаваў старарускі дарсальны запіс на дакуменце, здзейснены супрацоўнікамі велікакняжацкага архіва. Вышэйпазначанае дазваляе нам дакладна казаць пра ўваход гэтага дакумента ў велікакняжацкі архіў Альгерда Гедымінавіча.

Наступным дакументам, створаным ў кантэксце дыпламатычных зносін ВКЛ з ТО, з'яўляецца дамова паміж вярхоўным маршалам Куна фон Ганштэйнам з аднаго боку і вялікім князем літоўскім Ягайлам, а таксама князем Трокаў Скіргайлам – з другога. Тэкст дакумента быў напісаны на сярэдневерхненямецкай канцылярскай мове апошняй чвэрці XIV ст. [5, с. 455; 8, с. 56]. У каталозе пергамінавых дакументаў Бібліятэкі Чартарыйскіх у Кракаве пазначаны два дакумента пад 1382 г. Яны маюць сыгнатуры № 185 і № 186. Паводле інвентарных запісаў на адвароце гэтых двух дакументаў было ўсталявана, што рэгест у інвентары Кромера ідэйна супадае з дарсальным запісам дакумента № 185 і знаходзіцца ў бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве [9, s. 88–89]. Таму дакумент ідэнтыфікуецца як акт перамір'я паміж Куна фон Ганштайнам з аднаго боку і Уладзіславам II Ягайлам з князем Скіргайлам – з другога. На жаль, дакумент знаходзіцца не ў лепшым стане – пячаткі ўжо ў XIX ст. былі страчаны, ад іх засталіся толькі прымацаваныя ленты. Дакумент мае 8 невялікіх адтулін, з-за якіх не чытаецца некалькі літар. Па лічбавай копіі арыгінала бачна, што дакумент падлягаўся рэстаўрацыі – больш чым на 1/3 абклееены папіроснай паперай у пашкоджанай частцы. Тым не менш, тэкст дакумента публікаваўся некалькі разоў і яго найбольш дакладную рэканструкцыю зрабіў А. У. Ліцкевіч [10].

Пад 1385 г. у інвентары пазначаны тры рэгесты, першыя два з іх адносяцца да дыпламатычных стасункаў ТО і ВКЛ. Першы дакумент варта ідэнтыфікаваць як гарантыйны ліст на перамір'е вярхоўнага маршала ТО Конрада фон Валенрода ад 23 мая 1385 г., выдадзены вялікаму князю літоўскаму Ягайле. Ідэнтыфікаваць дакумент дазволіў зварот да лічбавай публікацыі тэксту дакумента і надпісу на яго адваротным баку, які цалкам супадае з інвентарным рэгестам. Другі дакумент з гэтай групы, пазначанай

пад 1385 г., поўнасцю ідэнтычны вышэйназванаму акту і таксама датуецца 23 мая 1385 г., аднак ён быў выдадзены ад імя вялікага магістра Конрада Цольнера фон Ротэнштайна [11].

Дакументы за 1387 г. прадстаўлены прывілеем Уладзіслава Ягайлы свайму брату вялікаму князю Скіргайле [5, с. 456]. Тэкст дакумента публікаваўся па арыгіналу з падрабязным апісаннем інвентара надпісу на адваротным баку прывілея ў «Полацкіх граматах». Інвентарны запіс на адваротным баку дакумента цалкам супадае з рэгестам з інвентара М. Кромера і дазваляе нам вызначыць дакумент як прывілей караля польскага Уладзіслава ІІ Ягайлы князю Літвы Скіргайле Альгердавічу на Троцкую зямлю, Менск і іншыя гарады ад 28 красавіка 1387 г. [13, с. 81].

Пасля ліквідацыі Рэчы Паспалітай як дзяржавы дакумент трапіў у Расійскую Імперыю. Але ў вопісе 1808 г., складзеным пры перадачы комплексу арыгінальных актаў на пергаміне і паперы з аддзела «Літоўскай метрыкі», пры трэцім дэпартаменце Сената ў Расійскую імператарскую бібліятэку прывілей увогуле не згадваецца [5, с. 462]. Як помнік старарускай пісьменнасці прывілей прыцягваў да сябе ўвагу калекцыянераў і трапіў у прыватныя рукі. У сваю чаргу, архіўны лёс дакумента паспрабаваў прасачыць А. У. Ліцкевіч. Так, даследчык правёў грунтоўнае даследаванне і даказаў, што пэўны час дакумент знаходзіўся па-за межамі збору Дуброўскага і толькі ў 1841–1842 гг. трапіў у рукапісны адзел РАН і з гэтага часу мае сыгнатуру 4.6.44 [14].

Другі рэгест пад датай 1387 г. інвентара М. Кромера тычыцца мірнага пагаднення паміж Лівонскім ландмайстарствам і ВКЛ [5, с. 456]. Галоўны ідэнтыфікацыйны маркер дакумента – узгадванне рыжскіх купцоў. Адпаведна, датычна дадзенай сацыяльнай групы, у дагаворы прадугледжвалася некалькі палажэнняў. Акрамя таго выразна пазначаны кантрагент з боку Лівоніі – ландмайстар Робін фон Эльц [5, с. 456]. Дарсальны запіс на дакуменце супадае з тэкстам рэгеста інвентара [8, с. 59; 12, s. 12–13; 13, с. 87–89]. Выключэнне складае толькі тое, што ў інвентары Кромера больш канкрэтна пазначаны аўтар дакумента: «Sub titulo magistri Robin de Eltz». Дата дакумента – 9 ліпеня 1387 г.

Далей тэксты рэгеста інвентара тычацца 1388 г. Пад ім пазначаны дакумент, які тычыўся праблемы вяртання палонных (captivis) з боку вялікага князя Скіргайлы. Контрагентамі з боку ТО выступалі вялікі маршал Энгельхард Рабэ і вялікі комтур Конрад фон Валенрод. Прааналізаваўшы каталогі і археаграфічныя публікацыі на прадмет наяўнасці такога дакумента, варта зрабіць выснову аб тым, што дакумент трэба датаваць 1388 г. Згодна з электроннай публікацыяй дакумента, уключаючы дарсальную памету на адваротным баку дакумента, мы можам заключыць, што гэта дагавор паміж Э. Фон Рабэ і Конрадам Валенродам з аднаго боку і князем Скіргайлам – з другога, заключаны 1 кастрычніка 1388 г. [8, с. 114–116].

1389 г. адзначаны дакументам, які тычыўся асабістых і палітычных адносін князя Вітаўта і вялікага князя літоўскага Скіргайлы. Указанне на месца «Lublini» дазваляе нам казаць, што перад намі грамата Вітаўта, выдадзеная ад яго імя вялікаму князю Скіргайле падчас люблінскага з'езду 29 мая 1389 г. Згодна з рэгестам, дакумент быў выстаўлены ў Любліне ад імя Вітаўта і быў адрасаваны князю Скіргайлу з абавязальніцтвамі прымірыцца і дапамагаць у выпадку знешняй пагрозы. Па стану на кан. XIX ст. дакумент знаходзіўся ў Расійскай імперыі. Зараз яго месцазнаходжанне і апісанне былі ўстаноўлены дзякуючы каталогу, змешчанаму на сайце Галоўнага архіва даўніх актаў у Варшаве [15].

1390 г. у інвентары прадстаўлен актам з боку Лівонскага Ландмайстарства аб перамір'і паміж ВКЛ і Лівоніяй [5, с. 456]. Звяраючы рэгест у інвентары Кромера і дарсальны надпіс на дадзеным акце, мы прыходзім да высновы, што дакумент, апісаны ў Кромера, зараз захоўваецца ў бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве, дзе мае сыгнатуру 222 Perg., vol. I/39 [9, s. 108]. Гэта перамірны акт, выстаўлены ад імя комтура Дзюнабурга Берндта Хефельмана [16].

Пад 1391 г. адносна велікакняжацкага архіва Скіргайлы выяўлены толькі адзін рэгест. Пад рэгестам можна ідэнтыфікаваць дакумент, выдадзены Уладзіславам Ягайлам свайму брату Скіргайле на Вільню, Віцебск, Мерач і Гародню [5, с. 456]. Паводле апісання рэгеста, прадстаўленага І. Даніловічам, дакумент ужо ў першай палове XIX ст. быў страчаны [5, с. 463]. Да нашых дзён арыгінальны дакумент пакуль не выяўлены і наўрад ці захаваўся. Згодна са структуры рэгеста, гэта была данацыйная грамата, паводле якой Скіргайла атрымаў у пажыццёвае ўладанне Вільно, Віцебск, Мерач і Гародню.

Пад 1392 г. у інвентары пазначаны перамірны акт, выдадзены Вітаўтам князю Скіргайле. 6 снежня 1392 г. пры пасрэдніцтве Ягайлы Вітаўт прымірыўся са Скіргайлам. Акт прымірэння, выданы Вітаўтам, складзены на сярэдневерхненямецкай мове. Хутчэй за ўсё, гэта сведчыць аб тым, што пісар, які быў тэхнічным выканальнікам волі вялікага князя літоўскага Вітаўта добра ведаў канцылярскія традыцыі Тэўтонскага ордэна або каралеўства Польскага [9, s. 114].

Такім чынам, комплекс дакументаў 1367–1392 гг. з велікакняжацкага архіва Альгерда, Ягайлы (да яго абрання польскім каралём у 1386 г.) і яго брата Скіргайлы трапіў у Кракаў. Актуальнымі для нас з'яўляюцца пытанні адносна прычын і часу перавозу архіва. Калі Ягайла быў абраны польскім каралём, ён склаў кантракт з вышэйшымі коламі польскай знаці і па ўмовах крэўскага акту павінен быў перавезці свой велікакняжацкі скарб у Польскае каралеўства. Пад скарбам у дадзеным выпадку трэба мець на ўвазе «усе каштоўныя рэчы». Часткай гэтага скарбу і быў велікакняжацкі архіў.

Велікакняжацкі архіў Скіргайлы мог трапіць у Кракаў або пасля страты ім статусу вялікага князя, намесніка Уладзіслава II Ягайлы, або пасля смерці, якая застала яго ў Кіеве ў 1395 г. Так, у верасні 1393 г. у скарбавай кнізе каралеўскага двара фіксуецца прыбыванне Скіргайлы пры двары Уладзіслава II Ягайлы [18, s. 245– 251; 19, с. 23]. Пасля верасня 1393 г. князь Скіргайла не адыгрываў палітычнай ролі ў ВКЛ і працяглы час прыбываў у Кракаве. Акрамя таго, у інвентары не фіксуюцца рэгесты дакументаў пазней 1393 г., якія б мелі сувязь з велікакняжацкім архівам Скіргайлы. Магчыма, што архіў мог знаходзіцца ўвесь час пры Скіргайле і пры падарожжы ў Кіеў у канцы 1394 г. Тым не менш, Скіргайла памірае 10 лютага 1395 г. у Кіеве, так і не пакінуўшы нашчадкаў. З гэтага можна зрабіць выснову, што Уладзіслаў II Ягайла, будучы законным спадкаемцам маёмасці князя Скіргайла як роднага брата загадаў перавезці архіў памерлага брата ў Кракаў, і менавіта з гэтага моманту архіў Скіргайлы выступае як адзін з дакументальных комплексаў ККА.

Аўтарам дадзенага артыкула была зроблена выбарка загалоўкаў дакументаў з аддзела «Litvania». Загалоўкі перакладзены на беларускую мову, у некаторых выпадках для большай дакладнасці загаловак дакумента падаецца сучаснымі тэрмінамі, прынятымі ў дакументазнаўстве. У асобным слупку даюцца сучасныя сыгнатуры месцазнаходжання ідэнтыфікаваных дакументаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Kosman, M.* Archiwum wielkiego księcia Witolda / M. Kosman // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawam archiwalnym / Organ naczelnej dyrekcji archiwów państwowych. – Warszawa, 1967. – T. 46. – S. 129–138.

2. *Jakubowski, J.* Archiwum państwowe W. X. Litewskiego i jego losy / J. Jakubowski // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawam archiwalnym. – Warszawa: Wydawnictwo archiwów państwowych, 1931. – T. 9. – S. 1–18.

3. Akta unji Polski z Litwą, 1385–1791 / Polska Akad. Umiejętności, tow. Naukowe Warszawskie; wydali S. Kutrzeba, W. Semkowicz. – Kraków: Drukarnia UJ, 1932. – XLI, 572 s.

4. *Wyczański, A.* Między kulturą a polityką. Sekretarze Zygmunta Starego 1506–1548 / A. Wyczański // Warszawa. – 1990. – 298 s.

5. Книга посольская Метрики Великого княжества Литовского, содержащая в себе дипломатические сношения Литвы в государствование короля Сигисмунда Августа с 1545 по 1572 год / Изд. М. Оболенский, И. Данилович. – М.: Ун-ая тип., 1843. – Ч. 1. – С. 455–457.

6. Zbiór Dokumentów Pergaminowych AGAD 1155–1370 Zastosowane skróty [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу http://agad.gov.pl/inwentarze/ute.xml. – Дата доступу: 29. 01. 2022.

7. *Полехов, С. В.* Древнерусские пометки на латинских документах в Великом княжестве Литовском и Польском королевстве второй половины XIV века / С. В. Полехов // Древняя Русь. Вопросы медиевистики. – 2021. – № 2 (84). – С. 27–40.

8. *Ліцкевіч, А. У.* Дагаворы паміж князямі ВКЛ, нобілямі Жамойці і прадстаўнікамі Тэўтонскага ордэна ў Прусіі і Лівоніі (1367–1398 гг.) / А. У. Ліцкевіч // Arche. – 2010. – № 10. – С. 39–123.

9. Katalog dokumentów pergaminowych Biblioteki Czartoryskich w Krakowie, cz. I, Dokumenty z lat 1148–1506, oprac. W. Szelińska, J. Tomaszewicz, Kraków 1975. – 396 s.

10. Перамірны ліст вялікага маршала ТО Куна фон Гатштайна з в. к. л. Ягайлай 23 мая 1385 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://starbel.by/dok/d094.htm. – Дата доступу: 06. 02. 2022.

11. Гарантыйны ліст аб перамір'і з боку Конрада Цольнера фон Ротэнштайна да в. к. л. Ягайлы 23 мая 1385 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://starbel.by/dok/d101.htm. – Дата доступу: 03. 02. 2022.

12. Codex epistolaris Vitoldi Magni Ducis Lithuaniae. 1376–1430 / collectus opera A. Prochaska. Kraków: Druk Wł. L. Anczyca i sp., 1882. – 1114 s.

13. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI века / Подготовили А. Л. Хорошкевич (отв. ред.), С. В. Полехов (зам. отв. ред.), В. А. Воронин [і інш.]. – М., 2015. – Т. 1. – 864 с.

14. Прывілей польскага караля, найвышэйшага князя літоўскага Уладзіслава II Ягайлы свайму брату князю Скіргайле 28 красавіка 1387 г. – Рэжым доступу: http://starbel.by/dok/d020.htm. – Дата доступу: 24. 01. 2022.

15. Zbiór Dokumentów Pergaminowych AGAD Wstępna wersja robocza IX '21 Inwentarz, układ w kolejności sygnatur [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://agad.gov.pl/inwentarze/preg_work.xml. – Дата доступу: 02. 02. 2022.

16. Акт мірнай дамовы паміж комтурам Дзюнабурга Берндтам Хефельманам і в. к. л. Скіргайлам 5 студзеня 1390 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://polona.pl/item/brat-bernt-hewelman-komtur-dyneburga-poswiadcza-ze-w-imieniu-wielkiego-mistrza-i,NTc3NDQ3NTc/1/#info:metadata. – Дата доступу: 01. 02. 2022.

17. *Daniłowicz, I.* Skarbiec diplomatów papiezkich, cesarskich, krolewskich, książęcych / I. Danilowicz. – Wilno: W drukarni A.H. Kirkora. – 1860. – T. 1. – 390 s.

18. *Piekosiński, F.* Rachunki dworu króla Władysława Jagiełły i królowej Jadwigi z lat 1388 do 1420 / F. Piekosiński. – Krakow: Nakładem Akademii Umiejętności. – 1896. – 616 s.

19. *Ліцкевіч, А. У.* Атручэнне князя Скіргайлы ў Кіеве (1395 год). Гістарычны каментарый і праблема аўтарства другой часткі «Летапісца вялікіх князёў літоўскіх» / А. У. Ліцкевіч. – Arche, 2012. – № 3. – С. 8–52.

**(Дата падачы: 23.02.2022 г.)**